**Н.Я.Петушко,**
*аспірантка кафедры бібліятэказнаўства*

# НАВУЧАННЕ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХАФІЗІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Праблема навучання і працаўладкавання дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця набыла асаблівае гучанне ў 90-я гг. у сувязі са зменамі, якія адбываліся ў эканоміцы.

Па ацэнках спецыялістаў, у кожнай чацвёртай сям'і ёсць інвалід. За апошнія два дзесяцігоддзі было шмат зроблена для прызнання правоў інвалідаў. Паваротным стаў 1981 г., калі па ініцыятыве ААН упершыню адзначаўся Міжнародны год інвалідаў. У гэты час праблемы інваліднасці атрымалі больш шырокае прызнанне і сталі разглядацца ў розных нацыянальных праграмах.

Стандартныя правілы ААН па забеспячэнні роўных магчымасцей для інвалідаў, прынятыя на Генеральнай Асамблеі ААН у 1993 г., з'яўляюцца міжнародным дакументам, які змяшчае прынцыпы, што датычацца правоў інвалідаў, і мінімальныя стандарты, якія павінны быць гарантаваны ім.

У Сусветнай дэкларацыі аб адукацыі, што была прынята ў 1990 г., падкрэсліваецца неабходнасць атрымання інвалідамі сярэдняй адукацыі, у прыватнасці гаворыцца, што "патрэбна пачаць крокі па забеспячэнні роўнага доступу да адукацыі для ўсіх катэгорый інвалідаў як неад'емнай часткі сістэмы адукацыі".

У Беларусі налічваецца больш за 350 тыс. дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і 22 912 дзяцей-інвалідаў. Калегіяй Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацавана і зацверджана Канцэпцыя навучання і выхавання, падрыхтоўкі да жыцця дзяцей з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця. У ёй абгрунтаваны асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай падрыхтоўцы дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, інтэграцыі іх у грамадстве.

Навучанне і выхаванне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на 05.09.1998 г. здзяйснялі 80 школ-інтэрнатаў, 18 спецыяльных школ, 847 класаў інтэграванага навучання, 27 спецыяльных дзіцячых садоў і 882 групы ў дзіцячых садах, 1005 дэфекталагічных пунктаў.

Пры Нацыянальным інстытуце адукацыі створана аддзяленне праблем дэфекталогіі, якім у 1995 г. распрацавана і зацверджана Палажэнне аб інтэграваным навучанні дзяцей і падлеткаў з асаблівасцямі псіхафічнага развіцця і дзяцей-інвалідаў. Пашыраецца сетка класаў міжінтэграванага навучання ў агульнаадукацыйных школах. Зараз у рэспубліцы іх налічваецца звыш 152. Распрацаваны і зацверджаны рознаўзроўневыя праграмы для I—IX дапаможных класаў ва ўсіх тыпах школ.

У 1996—1997 гг. Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання ўпершыню вырашаны пытанні выдання і выпуску нацыянальных альтэрнатыўных падручнікаў для спецыяльных школ усіх тыпаў (абавязкі ўскладзены на выдавецтвы “Полымя” і “Народная асвета”). Распрацаваны карэкціровачныя праграмы па развіцці прасторавай мабільнасці, мовы і псіхічных функцый. На аснове дадзеных праграм Цэнтральная бібліятэка для сляпых і грамадзян, якія дрэнна бачаць, распрацоўвае бібліятэчныя праграмы па навучанні прастораваму арыентаванню, бытавой рэабілітацыі (шляхам запісу на магнітныя дыскі).

Вядзецца работа па стварэнні індывідуальных праграм папярэдняга навучання з парушэннямі слыху і зроку і праграм спрошчанага навучання для дзяцей з цяжкімі формамі разумовай адсталасці. Міністэрствам адукацыі сумесна з Міністэрствам аховы здароўя і Міністэрствам сацыяльнай абароны ў 1995 г. распрацавана Інструкцыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб парадку індывідуальнага навучання дома дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

У адпаведнасці з рэспубліканскай комплекснай праграмай па праблемах інваліднасці, зацверджанай пастановай Савета Міністраў РБ 08.04.1993 г., № 720, Міністэрства адукацыі праводзіць пэўную работу па прафесійным навучанні дзяцей-інвалідаў. Створаны вучэбныя праграмы, па якіх могуць займацца інваліды, прадугледжана магчымасць іх перападрыхтоўкі з улікам медыцынскіх паказчыкаў. У даведніку для паступаючых у прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь надрукаваны спіс 32 сярэдніх спецыяльных навучальных установ, прафтэхвучылішч, у якіх могуць вучыцца дзеці-інваліды і дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця па 20 спецыяльнасцях.

Працягваецца эксперымент па падрыхтоўцы дэфектолагаў з ліку выпускнікоў спецшкол. Так, у 1995 г. Мінскі педагагічны каледж здзейсніў першы выпуск (15 чалавек) па спецыяльнасці “пазашкольная і пазакласная выхаваўчая работа ў спецыяльных школах, у якіх займаюцца дзеці з недахопамі слыху”.

У г. Мінску плануецца будаўніцтва навучальнай установы па бесперапыннай падрыхтоўцы спецыялістаў сярэдняга звяна з ліку інвалідаў з цяжкімі парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах краіны зараз на дзённым аддзяленні вучацца 215 падлеткаў-інвалідаў, у вышэйшых навучальных установах — звыш 90 студэнтаў-інвалідаў.

У Беларускім педагагічным універсітэце з 1992 г. вядзецца падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасцях “псіхолаг”, “сацыяльны педагог”, “дашкольны дэфектолаг” і інш. Пашырана падрыхтоўка праз завочную форму навучання. У Нацыянальным інстытуце адукацыі рыхтуюць аспірантаў па дэфекталагічных спецыяльнасцях. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры вучацца звыш 10 студэнтаў-інвалідаў (пераважна на ФБІС).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Рэспубліцы Беларусь плануецца стварэнне першай недзяржаўнай установы для інвалідаў, дзе будзе здзяйсняцца падрыхтоўка па юрыдычных і эканамічных спецыяльнасцях.

З 1996 г. уведзены спецыяльны курс па рэабілітацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, якія рыхтуюць педагагічныя кадры ўсіх спецыяльнасцей.

Для далейшага рашэння гэтай праблемы Міністэрства адукацыі РБ павінна мець інфармацыю аб патрэбах інвалідаў у адукацыі. Тут неабходны больш цесныя кантакты са спецшколамі, дзе лепш ведаюць здольнасці і таленты сваіх выпускнікоў. Патрэбны больш актыўная пазіцыя аб'яднанняў інвалідаў у правядзенні прафесійнай арыентацыі моладзі, а таксама актыўная пазіцыя бібліятэчных устаноў па інфармацыйна-дэфекталагічнай асвеце грамадства, з аднаго боку, і па каардынацыі выхаваўчай дзейнасці з аб'яднаннямі інвалідаў, з другога. Што датычыцца асоб з цяжкімі формамі інваліднасці, то для іх, на наш погляд, павінны быць створаны спецыяльныя навуковыя цэнтры прафесійнай адукацыі. Такія цэнтры мэтазгодна ствараць у кожнай вобласці з улікам патрэб грамадства, як адзначаецца ў законе Рэспублікі Беларусь "Аб прадухіленні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў".

**Н.Д.Піскун,**
*аспірантка кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

## АРХЕТЫПЫ І ПРАТАТЫПЫ ВОБРАЗА ЗАПАРОЖЦА ВА ЎКРАІНСКІМ ВЯРТЭПЕ І БЕЛАРУСКАЙ БАТЛЕЙЦЫ

Гісторыя падзелу грамадства на народнасці і нацыі зыходзіць з даўніх часоў, калі адносіны паміж людзьмі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ